ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## БЕЗ АДМЕНЫ ДАРОЖНАГА ЗБОРУ

*Спікер верхняй палаты наведаў Камітэт судовых экспертыз*

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, наведаў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз і азнаёміўся з асноўнымі напрамкамі яго работы. Старшыня Дзяржаўнага камітэта Андрэй ШВЕД расказаў пра матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае забеспячэнне органаў камітэта.**



Падчас абмеркавання была адзначана зацікаўленасць Дзяржкамітэта ў сумеснай працы з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Выказана прапанова аб арганізацыі сустрэч, на якіх бакі маглі б абмеркаваць магчымасць рэалізацыі сумесных праектаў, у тым ліку за кошт сродкаў рэспубліканскага інавацыйнага фонду.

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэўся з калектывам Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Спікер верхняй палаты парламента адказаў на пытанні супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта. У прыватнасці, адзін з удзельнікаў сустрэчы пацікавіўся, ці плануецца ў Беларусі адмяніць дарожны збор. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ў найбліжэйшы час такой меры не прадугледжана. Таксама прагучала пытанне, якое датычыцца правядзення ў Беларусі другіх Еўрапейскіх гульняў. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што ў нашай краіне створана сучасная спартыўная і гасцінічная інфраструктура, якая дазволіць дастойна прыняць спаборніцтвы такога ўзроўню.

## ПЯТАЯ РЭСПУБЛІКА СТАНОВІЦЦА БЛІЖЭЙШАЙ

*Мінск наведала група дружбы паміж парламентамі Беларусі і Францыі*

**Беларусь зацікаўлена ў сумесных праектах з Францыяй у сельскай гаспадарцы і біятэхналогіях. Пра гэта ішла размова на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА са старшынёй парламенцкай групы дружбы «Францыя — Беларусь» Нацыянальнага сходу Францыі Крыстафам ЛЕЖЭНАМ.**

Падчас перагавораў абмяркоўваліся ўмовы паглыблення гандлёва-эканамічных, міжпарламенцкіх, гуманітарных сувязяў паміж дзяржавамі. У тым ліку прапанавана актывізаваць партнёрства ў навукова-тэхнічнай сферы. Беларусь зацікаўлена і ў сумесных інавацыйных праектах з Францыяй па такіх перспектыўных напрамках, як племянная справа, малочная і мясная жывёлагадоўля, ільнаводства, біятэхналогіі.

Падчас сустрэчы намесніка старшыні Савета Рэспублікі Мар'яны Шчоткінай з дэлегацыяй групы дружбы «Францыя — Беларусь» віцэ-спікер павіншавала Крыстафа Лежэна з прызначэннем у верасні гэтага года на пасаду старшыні групы дружбы і выказала надзею на працяг актыўнага міжпарламенцкага дыялогу, які з'яўляецца важным інструментам пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін. На думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нашым краінам неабходна актывізаваць эканамічнае супрацоўніцтва, сувязі ў сферы развіцця турызму, стварэння сумесных вытворчасцяў.

## АБАРАНІЦЬ ПРАВЫ ДЗЯЦЕЙ

*Ірына Старавойтава ўзяла ўдзел у рабоце Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы. У ходзе пасяджэння была абмеркавана канцэпцыя законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах».**

Таксама Ірына Старавойтава як намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці ўдзельнічала ў пасяджэнні гэтай камісіі. Асаблівая ўвага была ўдзелена арганізацыі аказання дапамогі дзецям ранняга ўзросту з праблемамі ў развіцці, а таксама ўдасканаленню работы па паляпшэнні становішча падлеткаў і абароне іх правоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# МАШТАБ — АГУЛЬНАПЛАНЕТАРНЫ

**У Мінск прыехала місія MAPS, якая выпрацоўвае рэкамендацыі для краіны па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР)**

**Асноўная задача экспертаў місіі — пошук спосабаў садзейнічання дзяржавам, а таксама слабых месцаў, якія варта выпраўляць на нацыянальным узроўні, каб палепшыць агульную карціну з дасягненнем МУР. На працягу пяці дзён спецыялісты праводзяць у краіне сустрэчы ў профільных дзяржаўных органах, каб прааналізаваць стартавыя ўмовы для дасягнення Мэт устойлівага развіцця. У выніку місія распрацоўвае для краіны дарожную карту, якая носіць рэкамендацыйны характар.**



Злева направа: Ларыса БЕЛЬСКАЯ, Мар'яна ШЧОТКІНА, Санака САМАРАСІНХА, Бяціна МЕНЭ.

Па словах нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Мар'яны Шчоткінай, Беларусь выбудавала нацыянальную архітэктуру кіравання МУР, куды ўваходзіць і Савет па ўстойлівым развіцці. Віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыла, што ў нашай краіне распрацаваны два стратэгічныя дакументы — Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2030 года і Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады. У абодвух з іх у той ці іншай ступені ўлічаны крокі па дасягненні МУР. «Наша галоўная задача (Савета па ўстойлівым развіцці) — гэта ўкараненне паказчыкаў Мэт устойлівага развіцця ў рэспубліканскія, галіновыя, рэгіянальныя праграмы рознага ўзроўню і распрацоўка плана мерапрыемстваў, ці, іншымі словамі, дарожнай карты, у якую з розных праграм былі б зведзены ўсе мерапрыемствы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця», — падкрэсліла нацыянальны каардынатар.

Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што сістэма па дасягненні Мэт устойлівага развіцця была выбудавана з улікам нацыянальных асаблівасцяў. «Усё ж такі МУР — гэта мэты агульнапланетарнага маштабу. І тут у адзіночку працаваць ніхто не можа», — паведаміла віцэ-спікер верхняй палаты і дадала, што па гэтай рыначы ішла шчыльная работа разам з Міністэрствам замежных спраў.

Нацыянальны каардынатар таксама расказала пра структуру Савета па ўстойлівым развіцці. Гэта 32 намеснікі міністраў і прадстаўнікоў рэгіянальных органаў. Работа Савета падзелена па чатырох асноўных сектаральных групах — сацыяльная палітыка, статыстычныя даныя, экалогія, эканоміка. Яе каардынацыю ажыццяўляюць адпаведныя дзяржаўныя органы. У краіне праведзены шэраг семінараў для прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і няўрадавых арганізацый, наладжана работа па інфармаванні грамадства.

Віцэ-спікер падкрэсліла, што Беларусь у частцы дасягнення Мэт устойлівага развіцця працуе па ўсіх напрамках. Пытанне знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы. Мар'яна Шчоткіна выказала надзею, што ўзаемадзеянне з місіяй MAPS дазволіць больш эфектыўна і хутка прасоўвацца на гэтым шляху.

Пастаянны каардынатар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі Санака Самарасінха станоўча ацаніў работу, якую ўжо зрабіла наша краіна на шляху па дасягненні МУР: «Мы лічым, што Рэспубліка Беларусь ужо з'яўляецца і будзе надалей выдатным прыкладам для астатніх краін у плане дасягнення Мэт устойлівага развіцця».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# ВЫЙГРАЦЬ АБО СТРАЦІЦЬ?

**Ці пойдзе бізнес у вёску**

**Шэраг населеных пунктаў і тэрыторый Барысаўскага і Пухавіцкага раёнаў падпадаюць пад дзеянне Указа Прэзідэнта Беларусі ад 22 верасня №345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Іх пералік зацверджаны на нечарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.**

Адпаведны праект падчас пасяджэння агучыла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Таццяна Шаўцова. Яна канстатавала, што дакументам прадугледжаны шэраг ільгот для суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца гандлем, грамадскім харчаваннем і аказаннем бытавых паслуг. У тым ліку па аплаце падаткаў, рэалізацыі алкагольных напояў, развіцці інфраструктуры сетказых гандлёвых кампаній, а таксама адчужэнні аб'ектаў нерухомасці без аўкцыёнаў і наяўнасці дакументаў дзяржаўнай рэгістрацыі. Дзеянні некаторых ільгот распаўсюджваюцца толькі на населеныя пункты і тэрыторыі па-за іх межамі, пералік якіх вызначаецца абласным Саветам дэпутатаў.

Новаўвядзенне было спачатку апрабавана на базе Барысаўскага і Уздзенскага раёнаў. Гэтыя раёны ўзялі для пілотнага праекта невыпадкова. Адзін з іх — буйны прамысловы цэнтр, другі — невялікі па памерах. Распрацоўшчыкі мелі на мэце зразумець, што страціць бюджэт, калі ў далейшым гэтыя льготы распаўсюдзіць на ўсе населеныя пункты, бо на сённяшні дзень у Мінскай вобласці налічваецца да 90 працэнтаў паселішчаў, дзе пражываюць да 500 жыхароў.

**Эксперымент паказаў, што ў Барысаўскім раёне гандаль, грамадскае харчаванне і бытавое абслугоўванне не адыгрываюць значнай ролі ў фарміраванні кансалідаванага бюджэту: па падліках прыкладныя страты склалі 0,7 працэнта. А вось бюджэт Уздзенскага раёна «пахудзеў» на 4,1 працэнта.**

З улікам таго што дзеянне ўказа па льготах на падаткі будзе дзейнічаць на працягу пяці гадоў, прапанавана на першапачатковым этапе распаўсюдзіць прэферэнцыі на два раёны: Барысаўскі і Пухавіцкі. А па выніках работы за першае паўгоддзе 2018-га прааналізаваць, як яны спрацавалі.

— Калі мы ўбачым станоўчы эфект — развіццё прыватных аб'ектаў гандлю, зрухі да лепшага ў сістэме спажывецкай кааперацыі, стварэнне новых рабочых месцаў, — то, магчыма, варта будзе ўнесці змяненні ў гэты пералік, — лічыць Таццяна Шаўцова. — І пры неабходнасці мы будзем гэта рабіць. Пакуль жа мы спыніліся на прамысловым Барысаўскім раёне, дзе кіраўнік дзяржавы даў даручэнне навесці парадак і існуюць праблемы ў спажывецкай кааперацыі.

У спіс уключана 259 населеных пунктаў раёна, якія падпадаюць пад дзеянне льгот. Гэта тыя, дзе адсутнічаюць прадпрыемствы гандлю або ёсць адзін магазін спажывецкай кааперацыі, які, магчыма, не заўсёды адчынены. (Вядома, што на яго работу ўплывае, як правіла, сезоннасць, адсутнасць кадраў.) Акрамя таго, у пералік увайшлі дванаццаць тэрыторый сельсаветаў, дзе па-за межамі населеных пунктаў ёсць аб'екты прыдарожнага сэрвісу, турыстычныя аб'екты, якія маюць магазіны, кафэ, сталовыя, бытоўку.

У Пухавіцкім раёне вызначана 165 населеных пунктаў і 8 тэрыторый, а таксама тры пасёлкі, што адносяцца да малых гарадскіх паселішчаў з насельніцтвам ад 2 да 10 тыс. чалавек. Гэта Рудзенск, Свіслач і Праўдзінск. На стадыі распрацоўкі праекта было шмат дэбатаў. Перш за ўсё яны датычыліся наступнага пытання: што набудуць і што страцяць раёны ад гэтых навацый? Але палічыць страты пакуль немагчыма. Можа, мясцовыя бюджэты выйграюць за кошт падаходнага падатку, які будуць плаціць работнікі прадпрыемстваў гандлёвага і бытавога абслугоўвання. Але гэта ў тым выпадку, калі ў рэгіёны пойдуць прадпрымальнікі, бізнесмены, якія будуць адкрываць новыя пункты гандлю, грамадскага харчавання, бытавых паслуг, а значыць, з'явяцца і новыя рабочыя месцы.

У цэлым жа дакумент накіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для індывідуальных прадпрымальнікаў, юрыдычных асоб і ўдасканаленне абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці, паляпшэнне якасці жыцця. Пухавіцкі раён, дарэчы, размешчаны непадалёку ад Мінска, і, магчыма, ім зацікавіцца сталічны прыватны бізнес.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

У тэму

### Без дадатковых затрат

Частка зямель Смалявіцкага раёна адыдзе Мінску. Праект зацверджаны на пазачарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

Такое рашэнне прынята па аб'ектыўных прычынах. Справа ў тым, што ў Нацыянальным аэрапорце будуецца другая ўзлётна-пасадачная паласа з дапаможнымі аб'ектамі для цяжкіх самалётаў.

У гарадскую мяжу будуць уключаны зямельныя ўчасткі агульнай плошчай крыху больш за 158 гектараў, якія належалі мясцоваму лясгасу, сельгаспрадпрыемству «Штотц Агра-Сэрвіс». Рашэнне гэтага пытання не пацягне за сабой дадатковых фінансавых затрат.